УДК 378-057.875«1918/1939»

**В. У. Коваль**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

# ФАРМІРАВАННЕ СТУДЭНЦКІХ АСЯРОДКАЎ БЕЛАРУСКАЙ ДЫЯСПАРЫ Ў МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД

Артыкул прысвечаны пытанням фарміравання асноўных студэнцкіх асяродкаў беларускіх эмігрантаў у Чэхаславакіі, Італіі, Германіі, Злучаных Штатах Амерыкі, Латвіі, Літве ў міжваенны перыяд. Найбольш значным студэнцкім цэнтрам беларускай дыяспары стала Чэхаславакія. Адным з асноўных фактараў, які ўплываў на дзейнасць беларускай эміграцыі ў Чэхаславакіі, была «руская акцыя». У даследаванні асаблівая ўвага нададзена пытанню ўзаемадзеяння беларускай дыяспары з метраполіяй. Аўтар прыходзіць да высноў, што беларускія студэнты замежжа адрозніваліся высокім узроўнем арганізацыйнай актыўнасці. На аснове сучасных навуковых поглядаў можна сцвярджаць, што фарміраванне студэнцкіх асяродкаў замежжа стала важным механізмам для развіцця нацыянальнай ідэнтычнасці беларускай эміграцыі. Артыкул прадстаўляе беларускі студэнцкі рух як частку развіцця міжнародных студэнцкіх арганізацый у кантэксце сусветных маштабаў. Сродкі масавай інфармацыі ў Вільна і за мяжой апісвалі асноўныя падзеі студэнцкага жыцця. Грамадская актыўнасць беларускіх студэнтаў была важным фактарам іх адаптацыі да новых умоў побыту.

**Ключавыя словы:** беларуская дыяспара, беларуская эміграцыя, студэнцкі асяродак, нацыянальная ідэнтычнасць, Чэхаславакія, Італія, Германія, Злучаныя Штаты Амерыкі.

**V. U. Koval**
Belarusian State Technological University

# FORMATION OF THE STUDENT'S CENTERS OF THE BELARUSIAN DIASPORA DURING THE INTER-WAR PERIOD

The article dwells on the formation of the main student`s centers of the Belarusian emigrants in Czechoslovakia, Italy, Germany and the United States of America, Lithuania, Latvia during the inter-war period. Czechoslovakia was the most considerable student`s center of the Belarusian diaspora. One of the important factors changing the structure of the Belarusian emigration in Czechoslovakia was "Rusian action". Special emphasis is made on the cooperation between the Belarusian diaspora and mother country. The author comes to the conclusion about the high level of the organization activity of the Belarusian students. According to the contemporary view, the formation of the student's centers abroad has become an important mechanism for the development of the national identity of the Belarusian emigration. The research presents the Belarusian student's movement as a part of the international development in the context of the general world scale. The printed mass media in Wilno and abroad depicted the most important events of student's life. The public activity of Belarusian student's was the main factor for their adaptation to the new condition of the life.

**Key words:** Belarusian diaspora, Belarusian emigration, student's center, national identity, Czechoslovakia, Italy, Germany, United States of America.

**Уводзіны.** Асноўным крытэрыем для фарміравання дыяспары з'яўляецца працэнт інтэлектуальнай эліты эміграцыі, якая аказвае ўплыў на магчымасць самаідэнтыфікацыі эмігрантаў у новых умовах прымаючага грамадства. У працэсе даследавання асяродкаў замежжа важнае месца адводзіцца этнічным інстытутам і арганізацыям, асноўнай мэтай якіх было фарміраванне групавой нацыянальнай салідарнасці, калектыўных сувязей і нацыянальнай самасвядомасці.

Асобнай тэмай вывучэння спадчыны міжваеннай беларускай дыяспары з'яўляецца развіццё студэнцкага руху і станаўленне асноўных студэнцкіх асяродкаў замежжа. Беларуская моладзь, як найбольш актыўная і дынамічная частка эміграцыі, аказвала непасрэдны ўплыў на станаўленне нацыянальнай свядомасці дыяспары, садзейнічала ўнутрыгрупавому ўзаемадзеянню, развівала духоўную культуру беларускага народа за мяжой.

**Асноўная частка.** Асноўнай прычынай фарміравання беларускіх студэнцкіх асяродкаў у міжваенны перыяд стала дыскрымінацыйная палітыка польскага ўрада ў дачыненні да беларусаў у Другой Рэчы Паспалітай. Ствараліся абмежаванні для моладзі Заходняй Беларусі ў набыцці вышэйшай адукацыі, пра што рэгулярна пісала беларускамоўная перыёдыка. Газета «Сялянская ніва» падкрэслівала: «Як ведама,

польскі ўрад увесь час імкнецца да таго, каб у Заходняй Беларусі не тварыліся свае кадры інтэлігенцыі і такім чынам спрыяе ўсялякай беларускай эміграцыі за межы Польшчы» [1, с. 1]. Па сутнасці, парушаліся грамадскія свабоды нацыянальных меншасцей у Другой Рэчы Паспалітай.

Фарміраванне і развіццё беларускай дыяспары ў Чэхаславацкай Рэспубліцы (ЧСР) было звязана з этапамі правядзення дзяржаўнай праграмы пад назвай «Руская акцыя дапамогі», якая распачалася ў 1921 г. Мерапрыемствы акцыі складалі праграму падтрымкі эмігрантаў з тэрыторыі былой Расійскай імперыі, накіраваныя на развіццё палітычнага, адукацыйнага, навуковага і культурнага патэнцыялу дыяспар. За рэалізацыю праграмы адказвала Міністэрства замежных спраў ЧСР. Дзяржаўныя органы кантралявалі колькасць эмігрантаў, працэдуру іх легалізацыі ў краіне-рэцыпіенце, адсочвалі вылучэнне фінансавых сродкаў на патрэбы дыяспар, займаліся пытаннямі арганізацыі навуковых і вучэбных устаноў, сачылі за дзейнасцю аб'яднанняў і саюзаў эмігрантаў.

Асноўная частка беларускай моладзі набывала адукацыю ў чэшскіх навучальных установах, беларусы вучыліся ў Празе, Брно, Падэбрадах, Браціславе. Большасць беларускіх студэнтаў вучылася ў Карлавым універсітэце і Чэшскім вышэйшым тэхнічным вучылішчы (Пражская палітэхніка).

Адзін з самых вядомых у Еўропе Карлаў універсітэт уяўляў сабой вядучую адукацыйную ўстанову ў Чэхаславацкай Рэспубліцы. Замежныя студэнты набывалі вышэйшую адукацыю на юрыдычным, філасофскім, медыцынскім, тэалагічным і прыродазнаўчым факультэтах. Пражская палітэхніка мела лесатэхнічны, хіміка-тэхналагічны, электратэхнічны, машынабудаўнічы, архітэктурны і будаўнічы факультэты.

Гістарычнай ілюстрацыяй жыцця і дзейнасці беларускіх студэнтаў у Чэхаславакіі з'яўляецца біяграфія Івана Пятровіча Геніюша (1902–1979). Іван Геніюш выехаў у Чэхаславакію ў 1922 г. з мэтай атрымаць там вышэйшую адукацыю. Згодна з інфармацыяй яго асабістага лістка па ўліку кадраў, вучыўся ў Карлавым універсітэце з 1922 г. па 1936 г. на лекарскім факультэце [2, л. 92]. Неабходна падкрэсліць, што беларус адразу паступіў у вядучы чэшскі ўніверсітэт, што было зусім няпроста зрабіць.

Пра дакладную прычыну эміграцыі Івана Геніюша напісала віленская беларускамоўная перыёдыка. «Студэнт Праскага ўнівэрсытэту Геньюш, родам з Горадзеншчыны, шле з Прагі прывітаньне сваім родным і знаёмым. Варта заўважыць, што Геньюш у свой час быў ня прыняты "Кваліфікацыйнай Камісіяй" да Віленскага унівэрсытэту» [3, с. 3], – пазначалася ў газеце «Беларускі Звон». Нягледзячы на несправядлівае стаўленне да беларускай моладзі ў Другой Рэчы Паспалітай, прыклад Івана Геніюша мог даць надзею чытачам газеты на магчымасць атрымаць вышэйшую адукацыю за мяжой.

Біяграфія Івана Геніюша дэманструе той факт, што беларускія студэнты ў міжваеннай Празе актыўна супрацоўнічалі з установамі і арганізацыямі расійскай дыяспары. Сярод значных адукацыйных і навуковых цэнтраў расійскай эміграцыі ў Празе варта вылучыць Рускі педагагічны інстытут імя Я. А. Каменскага, Рускі юрыдычны факультэт, Рускі народны ўніверсітэт, Рускі інстытут сельскагаспадарчай кааперацыі, Рускі інстытут камерцыйных ведаў.

У дакументах Івана Пятровіча Геніюша захоўваецца студэнцкае пасведчанне Рускага юрыдычнага факультэта ў Празе, куды ён паступіў таксама ў 1922 г. [4, л. 54]. Здольны беларус стаў адным са студэнтаў юрыдычнага факультэта з моманту яго заснавання. І. Геніюш не атрымаў спецыяльнасці юрыста, бо ўстанову не скончыў. Цяжка цяпер сцвярджаць, па якой прычыне студэнт не працягнуў навучанне далей, бо не хапае дакументальных гістарычных крыніц. Хутчэй за ўсё ў маладога чалавека не хапіла грошай на атрыманне прэстыжнай юрыдычнай спецыяльнасці, бо Рускі юрыдычны факультэт быў створаны як прыватная вучэбная ўстанова. Плата за навучанне была высокай – 60 чэшскіх крон за семестр, там выкладалі вядучыя прафесары Маскоўскага, Пецярбургскага, Харкаўскага, Растоўскага, Кіеўскага ўніверсітэтаў [5, с. 197]. Відавочна, што ўвесь свой час Іван Геніюш прысвяціў заняткам на медыцынскім факультэце Карлавага ўніверсітэта.

Варта падкрэсліць, што супрацоўніцтва І. Геніюша з рускай дыяспарай было свядомым, бо пры запаўненні афіцыйных дакументаў ён дакладна пазначаў у графе нацыянальнасць – беларус. Пражскі інтэлектуальны цэнтр расійскай эміграцыі ў міжваенны час аказваў значны ўплыў на іншыя славянскія дыяспары.

Студэнт Іван Геніюш браў актыўны ўдзел у палітычным і грамадскім жыцці беларускай дыяспары. Значную дапамогу ў арганізацыйнай рабоце беларусу аказвала яго жонка. У 1935 г. Іван Пятровіч пабраўся шлюбам з Ларысай Антонаўнай Міклашэвіч (Ларысай Геніюш), якая ў 1937 г. прыехала да мужа ў Прагу. Нягледзячы на легальную працу Івана Пятровіча ў Празе, сям'я Геніюшаў да Другой сусветнай вайны так і не атрымала чэшскага грамадзянства. І. П. Геніюш пачаў сваю кар'еру ў якасці дэрматавенеролага, а пасля ўжо стаў завадскім урачом. Геніюшы пражылі ў Празе да 1948 г., да моманту іх арышту і высылкі ў Савецкі Саюз.

Значная частка беларускіх студэнтаў набывала адукацыю ва ўкраінскіх вышэйшых школах Чэхаславакіі. Студэнты-беларусы вучыліся ва Украінскім вольным універсітэце (складаўся з філасофскага і юрыдычнага факультэтаў), Украінскім вышэйшым педагагічным інстытуце імя М. Драгаманава (меў літаратурна-гістарычны, матэматычна-прыродазнаўчы і музычна-педагагічны факультэты), Украінскай гаспадарчай акадэміі (у склад якой уваходзілі эканоміка-кааператыўны, аграрна-лясны і інжынерны факультэты) і Украінскім тэхніка-гаспадарчым інстытуце, які стаў паслядоўнікам гаспадарчай акадэміі.

Навучанне ва ўкраінскіх вышэйшых школах для беларускіх студэнтаў у асноўным было бясплатным. Заняткі праводзіліся на ўкраінскай мове вядучымі педагогамі, якія мелі стаж працы ў аўстрыйскіх, расійскіх, польскіх і чэшскіх вышэйшых навучальных установах. Некаторыя беларусы атрымоўвалі адукацыю паралельна ў Карлавым універсітэце і ва ўкраінскай вышэйшай навучальнай установе.

Асобным аспектам даследавання беларускага студэнцтва з'яўляюцца сувязі эмігрантаў з метраполіяй. Складанымі і супярэчлівымі былі адносіны большасці беларускіх студэнтаў-эмігрантаў да БССР. Прагрэсіўная беларуская моладзь у Чэхаславакіі рэгулярна адсочвала падзеі ў Савецкай Беларусі, па-рознаму ўспрымала і аналізавала іх. Дакладна можна сцвярджаць, што адукаваным беларусам замежжа былі вядомыя імёны паэтаў, пісьменнікаў і вучоных БССР. Асаблівую цікавасць выклікалі візіты выбітных прадстаўнікоў навукі і культуры ў Прагу, пра што пісала не толькі савецкая прэса, але і перыядычныя выданні Заходняй Беларусі і беларускай эміграцыі.

Актыўныя кантакты з беларускімі эмігрантамі падтрымліваў і развіваў вядомы мовазнаўца і гісторык акадэмік Карскі Я. Ф. У рамках даследаванняў беларускай лінгвістыкі, этнаграфіі і этналогіі акадэмік вёў ліставанне з беларускімі арганізацыямі ў ЗША. Вучоны звяртаўся ў сваіх лістах да амерыканскіх беларусаў з просьбай лінгвістычнага аналізу для распрацоўкі навейшай народазнаўчай карты [6, с. 4]. Ініцыятыва даследчыка супала з перыядам ажыўлення палітычнага жыцця беларускай дыяспары ў Злучаных Штатах, які назіраўся ў пачатку 1920-х гг.

Міжнародныя кантакты акадэміка былі значна шырэйшымі. Газета «Сын Беларуса» апісвала супрацоўніцтва Я. Ф. Карскага з беларусамі ў Празе, куды яго накіравала на З'езд славянскіх этнографаў і географаў Пецярбургская акадэмія навук. У рамках сваёй камандзіроўкі вучоны правёў сход студэнтаў-беларусаў, які доўжыўся больш за чатыры гадзіны, бо шчыра зацікавіў удзельнікаў. На сходзе, ініцыяваным Я. Ф. Карскім, распавядалася пра стан культуры і адукацыі ў БССР. Газетны матэрыял перадае эмацыйнае напаўненне сустрэчы, уражанне самога вучонага і педагога Карскага Я. Ф.: «Студэнтамі тутэйшымі астаўся здаволены, дзівіўся выяўленай на сходзе сьвядомасьці іх. Адыходзячы сказаў: "Пацешылі старога, пацешылі!"» [7, с. 4]. Прыведзеныя факты толькі часткова дэманструюць шырокія міжнародныя сувязі Я. Ф. Карскага, які займаўся лінгвістычна-этнаграфічным аналізам і меў сусветную вядомасць. Вучонага накіроўвалі ў працяглыя замежныя камандзіроўкі, праз якія пашыраліся яго знаёмствы і кантакты з беларускімі эмігрантамі. Відавочна, што асоба Я. Ф. Карскага мела палітычную вагу для беларускага грамадства, выбітны мовазнаўца і гісторык заслужыў рэальны аўтарытэт у асяродку беларускай інтэлігенцыі замежжа.

Частка беларусаў у Чэхаславакіі таксама цёпла сустрэла ў Празе першага рэктара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Пічэту У. І. Выступленне рэктара перад беларускімі студэнтамі доўжылася пяць гадзін, на якім вучоны дакладна акрэсліў мэту свайго візіту ў Прагу: «Я вязу за межы Беларусь, пачаў Рэктар – еду казаць аб Беларусі, аб якой свет так мала ведае» [8, с. 2]. Афіцыйна прадстаўнік беларускай савецкай вышэйшай школы на сходзе намагаўся акрэсліць планы нацыянальнага будаўніцтва ў 1927 г., спрабаваў падключыць беларускую эміграцыю да праектаў БССР, аднак яго разлікі былі занадта аптымістычнымі. Рэктар БДУ Пічэта У. І. перадаў беларускім студэнтам падручнікі і мастацкую літаратуру, што з удзячнасцю было ўспрынята эмігрантамі.

Асобным фрагментам фарміравання беларускай дыяспары з'яўляецца дзейнасць студэнтаў-беларусаў у Італіі, якія набывалі там рэлігійную адукацыю. У Рыме будучыя ксяндзы праводзілі руплівую грамадскую працу, якая аказвала ўплыў на нацыянальную свядомасць беларускага народа. Беларусы вучыліся ў Грыгарыянскім і Арыентальным універсітэтах Рыма [9, л. 9]. Пра поспехі ксяндзоў-беларусаў рэгулярна публікавалі матэрыялы асобныя перыядычныя выданні, некаторыя газеты нават мелі спецыяльную рубрыку «Беларусы ў Рыме» (віленскія газеты «Biełaruskaya Krynica» і «Сын Беларуса»).

Будучыя ксяндзы на міжнародным узроўні выступалі з дакладамі пра свой народ. Адной з найбольш значных арганізацый беларускай моладзі ў 1920-я гады стала Аб'яднанне беларускіх студэнцкіх арганізацый (АБСА), якое дастаткова хутка выйшла на міжнародны ўзровень. Сярод заснавальнікаў Аб'яднання беларускіх студэнцкіх арганізацый былі прадстаўнікі студэнцтва Італіі [10, л. 2]. Цэнтральны орган

арганізацыі знаходзіўся ў Празе, аб'яднанне развівала міжнародныя кантакты са студэнтамі ЗША, Францыі, Германіі, Латвіі, Літвы. Нягледзячы на тое, что беларусаў у Рыме было мала (каля дзесяці чалавек), яны адрозніваліся ў перыяд станаўлення АБСА асаблівай матываванасцю ў сваёй арганізацыйнай рабоце, актыўнай грамадскай пазіцыяй. Найбольш здольным беларускім студэнтам у Рыме быў Ст. Хлакоўскі, пра поспехі якога нават пісала прэса Ватыкана.

Беларускія ксяндзы ў Італіі актыўна супрацоўнічалі з беларускай каталіцкай моладдзю Чэхаславакіі. Каталіцкае студэнцтва ў Празе ўзначальваў Ф. Грыцкевіч. Беларусы пэўны час абмяркоўвалі праект стварэння адмысловага часопіса для каталіцкага студэнцтва замежжа. Каталіцкая студэнцкая моладзь мела сталыя кантакты з Югаслаўскай каталіцкай лігай і харвацкімі каталікамі.

Важнай старонкай рэлігійнай гісторыі беларускай дыяспары сталі ўзаемаадносіны беларусаў у Рыме і Папы Рымскага Пія XI (Pius XI). У гады пантыфікату Пія XI была ўстаноўлена дзяржава Ватыкан, яго ўплыў на развіццё міжнародных адносін у міжваенны час спецыялісты ацэньваюць дастаткова высока.

Цікавымі гістарычнымі фрагментамі былі ініцыятывы беларускіх студэнтаў у Італіі. У 1924 г. беларускія ксяндзы ў Рыме пры падтрымцы нямецкага пасольства ў Ватыкане выступілі з прапановай адкрыць беларускую духоўную семінарыю [11, с. 1]. Гэта была ідэя арганізаваць нацыянальную навучальную ўстанову, якая б рыхтавала духавенства для беларускіх католікаў. У асяродку беларускай дыяспары ў міжваенны перыяд рэгулярна ўздымалася пытанне адкрыцця беларускай вышэйшай навучальнай установы за мяжой. У выніку дыскусій беларуская семінарыя ў Рыме так і не была створана. Польскія ксяндзы выказалі свой афіцыйны пратэст, што спыніла арганізацыйную працу. Нягледзячы на прынцыповую пазіцыю палякаў, беларускае пытанне зацікавала Папу, да яго зноў вярнуліся ў 1926 г. Да Папы Рымскага Пія XI на прыём, дзе абмяркоўваліся праблемы беларускіх каталікоў, былі запрошаны беларускія студэнты.

Беларускія ксяндзы ў Італіі актыўна развівалі кантакты з каталіцкім цэнтрам у Злучаных Штатах Амерыкі, дзе прадстаўнікі касцёла таксама прымалі актыўны ўдзел у палітычным жыцці дыяспары. Адной з важных ініцыятыў беларускіх эмігрантаў у ЗША стала ідэя стварэння касцёла ў Чыкага спецыяльна для каталікоў-беларусаў. Праект рэалізаваць не змаглі. Падобныя рэлігійныя ініцыятывы сведчаць аб тым, што беларускія эмігранты спадзяваліся вылучыцца з ліку каталікоў-палякаў, абаранялі сваю этнічную самасвядомасць ад уплываў больш колькаснай польскай дыяспары.

Чарговым еўрапейскім цэнтрам студэнцкага руху беларусаў замежжа стала Германія. Найбольш важным кірункам дзейнасці беларускіх эмігрантаў у Германіі была работа па легалізацыі дзеячоў эміграцыі ў розных краінах свету. Нямецкія марскія парты нярэдка станавіліся транспартным вузлом для падарожжа беларусаў у ЗША, Аргенціну і Канаду. Найбольш актыўная частка беларускай эміграцыі ў Германіі пражывала менавіта ў Берліне. Беларускія палітычныя арганізацыі намагаліся выкарыстоўваць магчымасці беларусаў у Берліне для дапамогі ў час падарожжа моладзі на вучобу ў Чэхаславакію. Звыклым маршрутам будучых студэнтаў у Прагу з тэрыторыі Заходняй Беларусі было падарожжа праз Коўна і Берлін.

Асноўная частка беларускіх эмігрантаў набывала адукацыю ў вышэйшых навучальных установах Берліна. Найбольшай папулярнасцю ў студэнтаў-замежнікаў карысталіся Берлінскі ўніверсітэт, Лесагаспадарчая вышэйшая школа і Гандлёвая вышэйшая школа ў Берліне.

У манаграфіі ўкраінскага эмігранта С. Нарыжнага «Украінская эміграцыя, Культурная праца ўкраінскай эміграцыі паміж сусветнымі войнамі» падкрэсліваецца, што беларуская моладзь у Германіі актыўна супрацоўнічала з грузінскімі і ўкраінскімі студэнтамі [12, с. 88]. Эмігрантамі ствараліся фонды дапамогі і камітэты, якія размяркоўвалі паміж лепшымі студэнтамі матэрыяльныя сродкі, дапамагалі вопраткай і прадуктамі. Неабходна падкрэсліць, што становішча студэнцтва ў Германіі пасля Першай сусветнай вайны было нялёгкім, матэрыяльная дапамога мела абмежаваны і нерэгулярны характар.

З 1932 г. у Берліне актыўную грамадскую працу разгарнуў Саюз беларускіх студэнтаў у Германіі. На старонках беларускамоўнай прэсы ў артыкуле пра дзейнасць саюза былі апублікаваны прозвішчы актывістаў арганізацыі: «У склад ураду яго ўвайшлі: Анатоль Шкутка – старшыня, Міхась Маскалік – сэкрэтар, Алесь Крыт – скарбнік, Расьціслаў Каплінскі – вольны сябра і Андрэй Бяроўскі – пачэсны сябра» [13, с. 6]. Саюз беларускіх студэнтаў у Германіі быў уключаны ў міжнародныя праекты, арганізацыя стала членам Цэнтральнага саюза замежных студэнтаў у Германіі.

Асобныя беларусы набывалі вышэйшую адукацыю ва ўніверсітэтах ЗША, аднак колькасць беларускіх студэнтаў у Злучаных Штатах Амерыкі была нязначнай. Для супольнасці замежжа паступленне беларусаў у амерыканскія навучальныя ўстановы з'ўлялася важнай падзеяй, пра якую нават размяшчалі інфармацыю ў прэсе.

Напрыклад, у газеце «Змаганне» за 25 лістапада 1923 г. апублікаваны артыкул «Беларус здабывае вышэйшую навуку», у якім распавядаецца пра поспех беларускага эмігранта Я. Чарапука, які быў залічаны на юрыдычны факультэт Чыкагскага ўніверсітэта. З матэрыялу становіцца зразумела, што на перспектыўнага беларускага студэнта разлічвала ўся нацыянальная дыяспара ў Чыкага, у артыкуле падкрэсліваецца: «Праз 3 гады мяйсцовая беларуская калёнія будзе мець ужо свайго феховага беларускага амэрыканскага адваката» [14, с. 4]. Газетны матэрыял заканчваецца словамі спадзявання, што яшчэ некалькі беларусаў змогуць паступіць у амерыканскія ўніверсітэты.

Асноўная маса прадстаўнікоў беларускай дыяспары ў ЗША была эканамічнымі эмігрантамі. Нацыянальнай супольнасці ў Злучаных Штатах патрэбна было развіваць кадры інтэлігенцыі, пра што рэгулярна публікавалі матэрыялы самі эмігранты. Праблемамі для павелічэння колькасці беларускіх студэнтаў у Амерыцы стала высокая плата за навучанне і недастатковы адукацыйны ўзровень большасці беларускіх эмігрантаў.

Разам з тым у другой палове 1920-х гг. існавалі асобныя праграмы падтрымкі моладзі для навучання ў ЗША, але іх было вельмі мала. На старонках газеты «Сялянская ніва» за 1927 г. сустракаецца матэрыял пад назвай «Да ведама беларускай вучнёўскай і студэнцкай моладзі», у якім падкрэсліваецца: «Ёсьць магчымасьць паехаць на навукі ў Амэрыканскія сярэднія і вышэйшыя школы для хлапцоў. Моладзь наша будзе прынята на поўнае ўтрыманьне» [15, с. 3]. Аб'ява для беларускай моладзі ў газету была зроблена Віленскім аддзелам Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры, інфармацыя паўтаралася некалькі разоў у розных нумарах газеты «Сялянская ніва» (№ 37, 38 за 1927 г.). З артыкула вынікае, што для навучання ў сярэдняй школе ЗША беларускім юнакам неабходна было мець пэўны ўзровень адукацыі: 4 класы гімназіі ці 7 класаў пачатковай школы, а для залічэння ў студэнты патрэбна было здаць выпускныя экзамены, якія ў Польшчы мелі назву «матура». У газетным матэрыяле пералічваўся спіс дакументаў для ўдзелу ў конкурсе. Тыповы для эміграцыі ў ЗША пералік дакументаў быў дастаткова доўгі і складаны ў падрыхтоўцы: заява, біяграфія, метрыка, пасведчанне аб адукацыі, пасведчанне аб стане здароўя, пасведчанне аб маральнасці, якое неабходна было падпісаць у святара ці ў афіцыйнай грамадскай установе.

Складана разважаць пра поспехі адукацыйнай праграмы ў ЗША, якую прапаноўваў Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры, бо не хапае гістарычных крыніц. Дзейнасць беларускай дыяспары ў ЗША ў канцы 1920-х гг. губляе сваю дынаміку, што можна патлумачыць наступствамі сусветнага эканамічнага крызісу і эміграцыйнымі квотамі, якія мелі афіцыйную заканадаўчую базу.

Як ужо адзначалася, беларускімі эмігрантамі актыўна абмяркоўвалася пытанне адкрыцця нацыянальнай навучальнай установы за мяжой. На старонках прэсы дастаткова эмацыйныя, з пэўным энтузіазмам падобныя дыскусіі праводзіліся ў 1920-я гг. Асноўныя надзеі беларусаў замежжа былі звязаны з праектам адкрыцця Беларускага народнага ўніверсітэта ў Коўна і Беларускага настаўніцкага інстытута ў Празе. На вялікі жаль, пералічаныя адукацыйныя праекты не былі рэалізаваны. Настаўніцкі інстытут у Празе адкрыць не змаглі, бо не хапіла кваліфікаваных выкладчыцкіх кадраў і фінансавай падтрымкі. Беларускі народны ўніверсітэт у Літве, які працаваў пад кіраўніцтвам Беларускага культурна-асветніцкага таварыства, праводзіў дадатковыя заняткі толькі ў выглядзе кароткатэрміновых курсаў для дарослых. Установа не давала сваім слухачам вышэйшай адукацыі.

Значнымі палітычнымі цэнтрамі беларускай дыяспары ў міжваенны перыяд сталі Літва і Латвія. Развіццё беларускай нацыянальнай сістэмы адукацыі ў Латвіі пачалося з арганізацыі курсаў для настаўнікаў у Дзвінску. Нацыянальныя школы і гімназіі спрыялі развіццю культурна-асветніцкай работы сярод беларускага насельніцтва ў Латвіі, якое кампактна пражывала ў правінцыі Латгалія.

Асноўная частка беларускай моладзі ў Літве набывала вышэйшую адукацыю ў Ковенскім універсітэце. Варта падкрэсліць, што ўніверсітэцкая бібліятэка (якую ўзначальваў Вацлаў Біржышка) мела багатую калекцыю беларускіх кніг, падрыхтаваную да друку Беларускім выдавецтвам у Літве [16, с. 191]. У 1937 г. больш за 15 000 экзэмпляраў беларускіх выданняў было перададзена студэнтам-беларусам Ковенскага ўніверсітэта.

**Заключэнне.** Такім чынам, эмігранцкі асяродак развіваў інтэлектуальны патэнцыял беларускай нацыі з ліку тых асоб, якія хацелі здабыць адукацыю, але былі абмежаваны ў правах па нацыянальнай прыкмеце ў Другой Рэчы Паспалітай. Уплывовыя студэнцкія асяродкі беларускай дыяспары былі створаны ў Чэхаславакіі, Італіі, Германіі, ЗША, Літве, Латвіі. Арганізацыі беларускай моладзі вызначаліся значным культурным патэнцыялам для нацыянальнай дыяспары, высокай ініцыятыўнасцю ў прымаючым грамадстве, шырокімі міжнароднымі кантактамі. Моладзь замежжа была накіравана на міжкультурны дыялог, актыўна ўдзельнічала ў міжнародных арганізацыях і праектах.

## Літаратура


1. Доля матурыстых // Сялянская ніва. 1927. № 40. С. 1.
2. ЦНБ імя Я. Коласа НАНБ. Ф. 31. Воп. 1. Адз. зах. 967. Арк. 92.
3. Прывітаньне з Прагі // Беларускі Звон. 1922. № 13. С. 3.
4. ЦНБ імя Я. Коласа НАНБ. Ф. 31. Воп. 1. Адз. зах. 967. Арк. 54–55.
5. Сабенникова И. В. Российская эмиграция (1917–1939): сравнительно-типологическое исследование. Тверь: Золотая буква, 2002. 431 с.
6. Акад. А. Карскі і амэрыканскія беларусы // Змаганьне. 1924. № 7. С. 4.
7. Студэнт. Беларусы ў Чэхіі // Сын Беларуса. 1924. № 10. С. 4.
8. Hryškiewič F. Z pryčyny byćcia ŭ Prazie Rektara Mienskaha Ŭniwersytetu, praf. Pičety / F. Hryškiewič // Biełaruskaja Krynica. 1927. № 29. S. 1–2.
9. БДАМЛМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 184. Арк. 9.
10. НАРБ. Ф. 459. Воп. 1. Спр. 5. Арк. 2.
11. Беларуская духоўная семінарыя ў Рыме // Сын Беларуса. 1924 г. № 35. С. 1.
12. Наріжний С. Українська еміграція. Культурна праця української еміграції між двома світовими війнами. Прага: Музеї візвольної боротьби України, 1942. 372 с.
13. Студэнцкая арганізацыя // Родны край. 1933. № 15. С. 6.
14. Беларус здабывае вышэйшую навуку // Змаганьне. 1923. № 9. С. 4.
15. Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры. Да ведама беларускай вучнёўскай і студэнскай моладзі // Сялянская ніва. 1927 г. № 37. С. 3.
16. Універсытэцкая бібліотэка ў Коўне // Калосьсе. 1935. Кн. 3. С. 191.


## References


1. Fate of graduates. *Syalyanskaya niva* [The Rural Field], 1927, no. 31, p. 3 (In Belarusian).
2. Yakub Kolas Central Scientific Library of NASB. Fund 31. I. 1. F. 967. L. 92.
3. Greeting from Prague. *Belaruski Zvon* [The Belarusian Ring], 1922, no. 13, p. 3 (In Belarusian).
4. Yakub Kolas Central Scientific Library of NASB. Fund 31. I. 1. F. 967. L. 54–55.
5. Sabennikova I. V. *Rossiyskaya emigratsiya (1917–1939): sravnitel’no-tipologicheskoye issledovaniye* [Russian emigration (1917–1939): the comparative and typological research]. Tver, Zolotaya bukva Publ., 2002. 431 p.
6. Academician A. Karsky and American Belarusians. *Zmagan’ne* [The Struggle], 1924, no. 7, p. 4. (In Belarusian).
7. Student. Belarusian in Czech. *Syn Belarusa* [The Son of Belarusian], 1924, no. 10, p. 4 (In Belarusian).
8. Hryshkevish F. By the visit of rector of the Minsk University professor Picheta to Prague. *Belaruskaya krynitsa* [The Belarusian Source], 1927, no. 29, pp. 1–2 (In Belarusian).
9. BSAMLA. Fund 3. I. 1. F. 184. L. 9.
10. NARB. Fund 459. I. 1. F. 5. L. 2.
11. The Belarusian theological seminary in Rome. *Syn Belarusa* [The Son of Belarusian], 1924, no. 35, p. 1 (In Belarusian).
12. Narizhny S. *Ukrayin’ska emigratsiya. Kul’turna pratsya ukrayin’skoyi emigratsiyi mizh dvoma svitovymy viynamy* [Ukrainian emigration. Cultural work of the Ukrainian emigration between two World wars]. Prague, Muzeyi wizvolnoyi borot’by Ukrayiny Publ., 1942. 372 p.
13. Student’s organization. *Rodnyiy Kray* [The Native Land], 1933, no. 15, p. 6 (In Belarusian).
14. The Belarusian gets higher education. *Zmagan’ne* [The Struggle], 1923, no. 9, p. 4 (In Belarusian).
15. The Belarusian Institute of Economy and Culture. For the Belarusian pupils and student’s youth. *Syalyanskaya niva* [The Rural Field], 1927, no. 31, p. 3 (In Belarusian).
16. University library in Kovno. *Kalos’se* [Ears], 1935, book. 3, p. 191 (In Belarusian).


## Інфармацыя пра аўтара


**Коваль Вольга Уладзіміраўна** – кандыдат гістарычных навук, старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: koval@belstu.by


## Information about the author


**Koval Volha Uladzimirauna** – PhD (History), Senior Lecturer, the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., Minsk, Republic of Belarus). E-mail: koval@belstu.by


*Паступіў 14.03.2019*